# ПРАБЛЕМЫ Ў ВЫРАШЭННІ ЖЫЛЛЁВАГА ПЫТАННЯ Ў ПОЛЬШЧЫ Ў 1970-Я ГГ.

**М. В. Рудкоўскі**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, пр. Незалежнасці, 4,*
*220030, г. Мінск, Беларусь, his.rudkovsk@bsu.by*
*Навуковы кіраўнік – М. С. Даўгяла, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

Пытанне асабістага жылля практычна ў любы перыяд існавання сацыялістычнай дзяржавы адлюстроўвала сацыяльна-эканамічны стан краіны. Таму польскія ўлады заўсёды старанна спрабавалі вырашыць дадзеную праблему, але кожны раз меліся пэўныя цэжкасці і праблемы, якія перашкаджалі гэтаму. Аднак з прыходам Э. Герэка да кіравання краінай у 1970 г., былі прадпрыняты значныя намаганні, каб канчаткова вырашыць гэтае пытанне. Нягледзячы на то, што быў дасягнуты прагрэс, існуючы стан гаспадаркі не дазволіў уладам выканаць мэты ў жыллёвым пытанні ў 1970-я гг.

***Ключавыя словы:*** асабістае жыллё; жыллёвае будаўніцтва; жыллёвае пытанне; Польская народная рэспубліка.

# ПРОБЛЕМЫ В РЕШЕНИИ ЖИЛИЩНОГО ВОПРОСА В ПОЛЬШЕ В 1970-Е ГГ.

**Н. В. Рудковский**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4,*
*220030, г. Минск, Беларусь, his.rudkovsk@bsu.by*
*Научный руководитель – М. С. Довгялло, кандидат исторических наук, доцент*

Вопрос личного жилья практически в любой период существования социалистического государства представлял собой социально-экономическое состояние страны. Поэтому польские власти всегда усердно пытались решить данную проблему, но каждый раз имелись определенные сложности и проблемы, которые мешали этому. Однако с приходом Э. Герека к управлению страной в 1970 г., были предприняты большие усилия, чтобы окончательно решить этот вопрос. Несмотря на то, что был достигнут прогресс, существующее состояние экономики не позволило властям выполнить цели в жилищном вопросе в 1970-е гг.

***Ключевые слова:*** личное жильё; жилищное строительство; жилищный вопрос; Польская народная республика.

У пасляваенны перыяд у Польшчы змены ў жыллёвай сітуацыі вызначаліся прынцыпамі цэнтралізаванага размеркавання інвестыцыйных сродкаў на будаўніцтва. Іх памер залежаў ад патрэбаў, якія вызначаліся

статыстычным дэфіцытам жылля, рэестрамі ў жыллёвых кааператывах і планаванымі эканамічнымі інвестыцыямі (узнікненне новых дзяржаўных прадпрыемстваў), якія прыцягвалі насельніцтва. У цэлым палітыка цэнтралізаванага размеркавання сродкаў спрыяла выраўнаванню ўмоў жыцця насельніцтва ў розных частках краіны [6, с. 22].

Падчас кіравання краінай Э. Герэкам (1970–1980) было шмат зроблена ў вырашэнні жыллёвага пытання, якое было адным з самых вострых і актуальных у краіне. Попыт па асобнае памяшканне ўяўляў сабой найбольш частую тэму зваротаў у партыйныя ўстановы, дзяржаўныя органы і ЗМІ розных узроўняў: прэсу, радыё, а затым і тэлебачанне. Значнасць гэтай праблемы таксама пацвярджаецца яе частым узнікненнем сярод патрабаванняў у забастоўках і нязменна першае месца сярод найбольш важных пытанняў, якія неабходна вырашыць у выніках сацыялагічных даследаванняў [2, с. 47].

Найбольш важным у жыллёвай палітыцы сямідзесятых гадоў павінен быў стаць разгляд жылля як фактару абумаўляльнага і, які дынамізуе сацыяльна-эканамічнае развіццё. Улады пачалі ўсё больш звяртаць увагу на ролю жылля як кампанента спажывання. У сувязі з гэтым, улады пачалі праводзіць змены ў сацыяльна-эканамічнай палітыцы, якія былі ўнесены на VI з’ездзе ПАРП. Гэтая эканамічная стратэгія ўладаў заключалася ў тым, каб за 1971–1975 гг. значна палепшыць умовы жыцця. Такім чынам, у 1972 г. была прынята перспектыўная праграма жыллёвага будаўніцтва і паляпшэння жыллёвых умоў у Польшчы, распрацаваная на аснове ўсебаковага аналізу патрэб насельніцтва, які прадугледжваў будаўніцтва на працягу двух дзесяцігоддзяў каля 7 мільёнаў кватэр. Яе рэалізацыя павінна была прынесці значнае павялічэнне памераў жыллёвага будаўніцтва і паляпшэнне будаўнічых стандартаў як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці. Таксама дзякуючы мадэрнізацыі або замене значнай часткі састарэлага жыллёвага фонду праграма таксама прадугледжвала паляпшэнне іх якасці. Паводле задумы плана, да другой паловы 1980-х гг. павінны былі б вырашаны асноўныя праблемы, як тады абяцалі “кожнай сям’і – самастойная кватэра” [2, с. 50].

У 1974 г. быў створаны карпаратыўны жыллёвы фонд, які палягчаў работнікам атрыманне жылля, а закон аб жыллі дазволіў прадаць кватэры арандатарам. Стымулятарам жыллёвага будаўніцтва было арганізаванне шматлікіх зборных заводаў (“фабрыкі дамоў”), якія рыхтывалі элементы для буйнапланавага будаўніцтва [3, с. 340].

Канцэпцыя будовы жылля па савецкім узоры была зменена буйнапанэльным будаваннем. Яна ўяўляла ў сябе тэхналогію складывання гатовых канструкцый на месце, што і дазваляла вельмі хутка будаваць памяшканні. Сцены ў гэтых дамах будаваліся з гатовых пліт, у чым і за-

ключалася праблема. Па-просту гэтыя пліты былі нізкай якасці, на якіх узнікалі трэшчыны. Таму на канчатковых этапах перад здачай кватэры патрэбна было яшчэ латаць трэшчыны.

Яшчэ адзін фактар, які перашкаджаў вырашэнню жыллёвага пытання ў Польшчы ў 1970-я гг. складаўся ў тым, што ў тыя часы адбывалася сталенне пакалення пасляваеннага дэмаграфічнага буму, колькасць якога складала амаль 10 млн чалавек. Сярод яго каля 65 % дасягнула 20 гадоў да 1975 г., што прывяло да павелічэння патрэбных у асабістым жыллі [1, с. 54]. Да гэтага яшчэ далучыўся працэс больш шырокай ўрбанізацыі насельніцтва. Калі ў 1970 г. у гарадах жыло 13 млн чалавек, то ў 1978 г. стала 15,7 млн. (у вёсцы за 8 гадоў лічба ў 11 млн чалавек засталася) [1].

У вёсцы таксама меліся пэўныя праблемы. Па-першае там існаваў недахоп будматэрыялаў і арганізацый, якія будавалі жыллё ў вёсцы. Па-другое ў вёсцы хуткасць будовы жылля была меншай, бо колькасць сельскага насельніцтва не павялічвалася. Да гэтага дадаваўся факт таго, што ў вёсцы аснашчэнне тэхнічнай інфраструктурай было горшым за гарады. Гэтая недастатковая ступень аснашчэння вёскі элементамі інфраструктуры зніжала ўзровень жыцця і прывабнасць сельскіх раёнаў для жыллёвага будазніцтва патэнцыйнымі інвестарамі [6, с. 25–26].

Трэба адзначыць, што ў рамках так званага “эканамічнага манеўру” (эканамічнай палітыкі Э. Герэка з 1976 г. на скарачэнне расходаў) многія інвестыцыі былі скарочаны. Аднак сродкі на інвестыцыі ў жыллёвае будаўніцтва (акрамя сыравіннай і энергетычнай галін, транспарту і сельскай гаспадаркі) не скараціліся. Але ў выніку гэты накірунак не стаў паспяховым, бо крыніцы краху эканомікі былі звязаны з палітыкай фінансавання эканамічнага развіцця, заснаванай на абавязках выплаты крэдытаў заходнім краінам.

Колькасць здадзеных у эксплуатацыю кватэр павялічылася з 194 тыс. у 1970 г. да 264 тыс. аднак у 1975 г., але гэта не паменшыла чаргі чакання ў кааператывах на жыллё. У 1978 г. было пабудавана 284 тыс. кватэр. Гэты рэкорд ні раней, ні пазней не пераўзышлі. У агульнай складанасці з 1971 па 1980 год было пабудавана больш за 2400 тыс. новых памяшканняў, і гэта было значна больш, чым раней (у 1961–1970 гг. 1700 тыс., а ў 1981–1990 гг. – крыху больш за 1800 тыс.) [5, с. 136].

Асобную ролю адыграла зіма 1978/79 гг., якая была вельмі халоднай, што выклікала дадатковыя праблемы. У выніку некалькі месяцаў ніякіх будаўнічых работ не вялося. Крызіс, які рушыў услед, таксама негатыўна паўплываў на будаўнічы сектар. Не хапала матэрыялаў, інструментаў, дэталяў. У выніку будаўнічая эканоміка павалілася.

У 1980 г. было пабудавана на 20 % менш жылых дамоў, чым за папярэднія гады [4, с. 159].

Нягледзячы на павелічэнне колькасці дамоў кожны год, чаргі не зменшыліся. Маладым людзям, якія толькі ўступаюць у жыллёвыя кааператывы, даводзілася чакаць да некалькіх гадоў. Яны таксама не маглі разлічваць на службовыя кватэры, бо яны вылучаліся ў першую чаргу супрацоўнікам з вялікім стажам. Гэтыя праблемы ў будучыні сталі істотнымі прычынамі росту сацыяльнай незадаволенасці, што знайшло адлюстраванне ў патрабаваннях забастоўкі 1980 г.

Такім чынам, палітыка ўладаў ў жыллёвым будаўніцтве 1970-х гг. значна палепшыла ўмовы жылля палякаў, але ў той жа час маштабы патрэбаў у ім і іншыя праблемы былі таксама надзвычай вялікія і цяжкія, што не дазволіла урадам Э. Герэка падысці да вырашэння дадзенага пытання ў бліжэйшы час.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Dane ogólnopolskie 1921–2011 [Electronic resource], Główny Urząd Statystyczny. URL: https://stat.gov.pl/download/gfx/portalinformacyjny/pl/defaultstronaopisowa/5737/1/1/dane_ogolnopolskie_1921_2011.xlsx (date of access: 02.06.2024).

2. *Jarmuż M.* Problemy mieszkaniowe w latach siedemdziesiątych XX wieku. Warszawa: Instytut historii PAN, 2020.

3. *Kaliński J. Landau. Z.* Gospodarka Polski w XX wieku. Warszawa: Polskie Wydawnictwo Ekonomiczne, 1998.

4. *Kaliński J.* Od kwestii robotniczej do nowoczesnej kwestii socjalnej. Studia z polskiej polityki społecznej XX i XXI wieku. Rzeszów, 2017.

5. Leszczyńska C. Historia Polski w liczbach (Polska 1918–2018). Warszawa: Główny Urząd Statystyczny, 2018.

6. *Wesołowska M.* Rozwój budownictwa mieszkaniowego a przemiany przestrzenne wsi województwa lubelskiego. Warszawa: Wydawnictwo «Bernardinum», 2006.